№№172–173
(2483–2484)

27 кастрычніка 2006 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

Да ўвагі!

Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

У «Народнай волі» — свой сайт!

Паважаныя чытачы “Народнай волі”!

Знайсці нас у Інтэрнеце можна па адрасе **www.nv-online.info**

Там вы зможаце прачытаць артыкулы апошніх нумароў газеты і абмеркаваць іх, даведацца пра падзеі ў краіне і свеце на стужцы навін, напісаць электронны ліст у рэдакцыю.

Архіў газеты можна паглядзець па адрасе **http://nv.promedia.by**

РЭБУС

Што з «Віцязем»?



Днямі Аляксандр Лукашэнка заслухаў справаздачу аб сітуацыі на віцебскім РУВП “Віцязь”.

Большасць паведамленняў афіцыйных інфармагенцтваў “настойваюць” на эканамічнай складаючай прайшоўшага мерапрыемства. Аднак нават на першы погляд тэма, што была ўзнята дзяржаўнымі СМІ, яўна дысаніруе з тымі асобамі, з якімі А.Лукашэнка вырашыў паразмаўляць аб “Віцязі”.

На пасяджэнні, па паведамленні “Інтэрфакса”, за выключэннем першага намесніка прэм’ер-міністра Уладзіміра Сямашкі і генеральнага дырэктара РУВП “Віцязь” Валерыя Нікіфарава, прысутнічалі “нецывільныя” асобы. Прычым якія! “Віцязем” раптам зацікавіліся адразу і дзяржаўны сакратар Савета небяспекі Віктар Шэйман, і міністр унутраных спраў Уладзімір Навумаў, і намеснік генеральнага пракурора Барыс Тарлецкі.

Адзначым, што напярэдадні нарады ў прэзідэнта віцебскі тэлевізійны завод “Віцязь” прагучаў у зводцы МУС. Некаторая частка яе была агучана прадстаўніком гэтага ведамства на прэс-канферэнцыі ў Доме прэсы 20 кастрычніка. У прыватнасці, старшы ўпаўнаважаны па асабліва важных справах Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй МУС Аляксандр Вадзяны распавёў аб расследаванні карупцыйных злачынстваў, здзейсненых з удзелам службовых асоб “Віцязя”. Канкрэтыкі на прэс-канферэнцыі прагучала мала. А.Вадзяны паведаміў толькі, што гэтым асобам інкрымінуецца атрыманне хабару ў памеры 100 тысяч долараў.

Гэта, несумненна, значная сума, але ўсё-такі, як нам падаецца, не тая, дзеля якой трэба склікаць асобную нараду з удзелам прэзідэнта і галоўных сілавікоў краіны. А ў тым, што менавіта фактам карупцыі на заводзе была прысвечана прайшоўшая нарада, у нас практычна няма сумневу.

Па інфармацыі “Е”, пацверджанай у праваахоўных органах, з вясны бягучага года на самай справе распрацоўваецца тэма карупцыі на віцебскім заводзе “Віцязь”. У лік фігурантаў серыі крымінальных спраў уваходзяць некалькі чалавек, у тым ліку непасрэдныя падначаленыя генеральнага дырэктара “Віцязя”. Больш за тое, як удалося высветліць “Е”, адзін з падазроных ужо аб’яўлены ў міжнародны вышук па лініі Інтэрпола. Ён вясной, калі толькі раскручвалася гэтая справа, пакінуў Беларусь і схаваўся ў Расіі. Беларускім сілавікам ёсць чаго звярнуцца па дапамогу ў Інтэрпол. Хабар хабарам, але “Віцязю” з-за незаконнай дзейнасці некаторых асоб быў нанесены яшчэ і сур’ёзны матэрыяльны ўрон, які вымяраецца некалькімі мільёнамі долараў.

Па інфармацыі “Е”, у праваахоўных органах зараз актыўна вывучаецца сістэма збыту тэлевізараў, якая існавала ў “Віцязя” ў Беларусі і Расіі. Менавіта з гэтай прычыны работа фірменнай сеткі завода зараз практычна паралізавана. У поле зроку праваахоўных органаў таксама трапіў шэраг кантрактаў, якіх вельмі шмат і на значныя сумы заключаў завод у апошні час. Прычым частка гэтых кантрактаў не мела ніякага дачынення да тэлевізійнай тэхнікі. “Віцязь” за апошнія некалькі гадоў за кошт дзяржаўных сродкаў, якія штогод яму выдзяляліся з дзяржбюджэту, стаў буйным вытворцам мэблі, збіраўся асвоіць выраб сілікатных блокаў і нават заказаў паліграфічнае абсталяванне. І гэта нягледзячы на тое, што яго магутнасці па вырабе тэлевізараў загружаны не больш як напалову.

Нам, на жаль, не вядома, чым у выніку скончылася нарада ў прэзідэнта. Але “Віцязь”, калі зыходзіць з паведамленняў афіцыйных СМІ, зноў атрымае дзяржаўную падтрымку. “Рынак тэлевізійнай прамысловасці вельмі складаны. Ды і ў нас у Беларусі за продаж тэлевізараў трэба змагацца вельмі моцна. Складанасцяў дастаткова. Таму гэтыя прадпрыемствы маюць патрэбу ў эфектыўнай падтрымцы”, — заўважыў А.Лукашэнка.

ІНФАРМАЦЫЯ ПА СПРАВЕ

РУВП “Віцязь” было заснавана ў 1976 годзе. Сёння на ім працуе 5 тысяч чалавек. Прадпрыемства вырабляе больш за 80 мадэляў тэлевізараў (да канца года асартымент плануецца павялічыць больш як на 150 мадэляў), а таксама медыцынскае абсталяванне, мэблю, будматэрыялы, пажарную тэхніку. Прадукцыя РУВП “Віцязь” рэалізуецца ў Беларусі, Расіі, Украіне і іншых краінах.

Міхаіл РАДКЕВІЧ.

Аблава

Падатковыя інспектары Мінска выявілі з пачатку кастрычніка каля 190 таксістаў-нелегалаў. Лавіць іх дапамагае сталічная асацыяцыя таксі.

73 парушальнікі былі злоўленыя паўторна. У іх асабісты транспарт можа быць канфіскаваны.

На будучыню сталічная інспекцыя плануе ладзіць праверачныя рэйды ў тры змены — зранку, удзень і ўначы. На сённяшні дзень адпаведным органам вядомыя каля 200 таксістаў-нелегалаў. Аднак у транспартнай інспекцыі лічаць, што насамрэч іх каля 5 тысяч чалавек, інфармуе БЕЛТА.

Самыя старыя могілкі

На Гродзеншчыне знойдзены мізар — татарскія могілкі XV—XVIII стагоддзяў. Гісторыкі заявілі, што гэта самыя старыя татарскія могілкі ў Беларусі. Героі, што пахаваныя ў гэтым месцы, змагаліся яшчэ за Вялікае княства Літоўскае.

Могілкі знайшлі каля вёскі Каробчыцы, уздоўж трасы на Беласток. Гаспадары катэджаў, размешчаных паблізу, нават не падазравалі, што побач з імі — надмагіллі.

Дарэчы, пад Гродна татары жылі якраз з XV па XVIII стагоддзе. Яны абаранялі нашыя землі ад ворагаў і атрымлівалі за гэта зямельныя надзелы. Сёння ў Беларусі жывуць каля 10 тысяч татар.

Архіў роду Радзівілаў: вядзецца пошук

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі сумесна з фондамі Літвы, Польшчы і Украіны рэалізуе міжнародны праект “Архіў роду Радзівілаў”. Паводле слоў кіраўніка ўстановы Алы Галубовіч, у нас знаходзіцца большасць дакументаў князёў Радзівілаў (каля 26 тысяч адзінак) з XIV стагоддзя па 1939 год. Другая вялікая частка захоўваецца ў Варшаве. Невялікай колькасцю дакументаў валодае Літва і Украіна. Першапачаткова граматы, перапіска Радзівілаў па розных пытаннях, а таксама радаводы, генеалагічныя табліцы і іншыя дакументы знаходзіліся ў Нясвіжскім архіве, створаным у 1551 годзе.

(Па паведамленнях інфармагенцтваў.)

ТАМ, ЗА РЕШЕТКОЙ

Козулин и Скребец обязаны посещать столовую

С пятницы в витебской колонии голодают экс-кандидат в президенты и бывший депутат Палаты представителей

Информацию о том, как проходит голодовка и как чувствуют себя известные заключенные “Витьбы-3”, можно получить только у руководства колонии. Лишь в конце этой недели планирует встретиться с Козулиным его адвокат Игорь Рынкевич. А письма из колонии, которые получили родные политиков, были отправлены еще до начала голодовки.

По словам заместителя начальника колонии по режиму Руслана Приймака, и Козулин, и Скребец чувствуют себя как будто нормально. Каждый день их осматривает врач медсанчасти и делает соответствующую запись в медкарточках заключенных.

— Никаких жалоб со стороны этих заключенных не поступало, — сказал в телефонной беседе журналисту “Народной воли” Руслан Приймак. — Я не заметил, чтобы они похудели. И Козулин, и Скребец соблюдают распорядок, установленный в ИК, работают. С удовольствием прогуливаются в столовую. По крайней мере, так говорят...

Александра Козулина и Сергея Скребца администрация колонии не изолировала в отдельное помещение. Хотя ранее говорилось о том, что на время голодовки возможно их нахождение в медсанчасти колонии. Козулин и Скребец продолжают работать. Козулин — кладовщиком, Скребец — рабочим.

Жены политиков опасаются за здоровье мужей. Ирина Козулина говорит, что, когда Александр Владиславович начал голодовку, то был сильно простужен. Кроме того, зная характер мужа, она не уверена, что тот на самом деле чувствует себя хорошо, как говорит. Ирина Ивановна накануне голодовки посылала мужу литературу о том, как правильно голодать, и очень надеется, что муж не просто отказался от еды, а голодает по правилам.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

Александр Козулин объявил бессрочную политическую голодовку в знак протеста против незаконного, как он считает, нахождения у власти Александра Лукашенко. Экс-кандидат в президенты, бывший ректор БГУ, профессор Козулин протестует “против творимого в стране беззакония” и таким образом пытается привлечь внимание к ситуации в Беларуси Организации Объединенных Наций. Козулин сказал родным, что прекратит голодовку в том случае, если белорусский вопрос будет заслушан на Совете Безопасности ООН.

Бывший депутат Сергей Скребец поддержал требования Александра Козулина и в знак солидарности с политиком тоже объявил голодовку. Скребец также протестует против того, что до настоящего времени не представлен к условно-досрочному освобождению. В феврале этого года Скребец был осужден на 2,5 года в исправительной колонии.

Вячаслаў ОРГІШ,
доктар філасофскіх навук

Яшчэ раз пра любоў,

альбо Аб тым, як збіраюцца абвесці вакол пальца беларусаў

На мінулым тыдні (18 кастрычніка) здарылася чарговае абвастрэнне хранічнай інтэграцыйнай хваробы Масквы і Мінска. Як паведамілі сродкі масавай інфармацыі, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір Канаплёў пабываў з візітам у Першапрастольнай, дзе сустрэўся са спікерамі абедзвюх палат расійскага парламента Міронавым і Грызловым. Бакі зноў абмяркоўвалі працэс саюзнага будаўніцтва, дакладней, праблемы распрацоўкі і прыняцця так званага Канстытуцыйнага акта саюзнай дзяржавы, над якім працуюць парламенцкія камісіі дзвюх краін.

Да чаго прызвычаілася грамадскасць

Бакі канстатавалі, што ўсе пытанні, даручаныя кіраўнікамі Расіі і Беларусі парламенцкім камісіям, ужо вырашаны. Сп. Канаплёў упэўнена заявіў: *“Праект Канстытуцыйнага акта падрыхтаваны. Ёсць невялікія тэхнічныя пытанні. Яны будуць вырашацца на Вышэйшым дзяржаўным савеце. Гэта пытанні саюзнага парламента, выбараў старшыні саюзнага саўміна (ці іх вышэйшы савет будзе вырашаць, ці спатрэбіцца зацвярджэнне саюзнага парламента). Пытанне правядзення рэферэндумаў... Ці іх праводзіць па заканадаўстве канкрэтнай краіны, ці, калі ўжо, дапусцім, будзе створана саюзная дзяржава, па яе канстытуцыі”.* Такім чынам, пазіцыі Канстытуцыйнага акта, якія патрабуюць узгаднення на вышэйшым узроўні, павінны разглядацца на Вышэйшым дзяржсавеце прэзідэнтаў Расіі і Беларусі, які плануецца правесці да канца бягучага года.

Грамадскасць дзвюх краін ужо прызвычаілася да таго, што Крэмль і беларускі “Чырвоны дом” раз-пораз (звычайна, калі падпірае палітычная альбо эканамічная патрэба) абвастраюць інтэграцыйную гульню, аднак потым яна па тых ці іншых прычынах зноў і зноў запавольваецца, калі не сказаць супыняецца. Шмат хто ўжо разглядае інтэграцыйны праект як своеасаблівае палітычнае вынаходніцтва, з дапамогай якога кіруючыя групоўкі Расіі і Беларусі вырашаюць свае палітычныя праблемы. Усё часцей можна пачуць меркаванні накшталт таго, што гэты праект ніколі не будзе завершаны. Маўляў, Масква і Мінск насамрэч кіруюцца несумяшчальнымі падыходамі і чакаюць ад інтэграцыйных намаганняў зусім розных вынікаў. Крэмль хоча ўсталяваць над Беларуссю эканамічны кантроль і, калі ўдасца, зрабіць яе часткай Расійскай Федэрацыі. Гаспадар жа “Чырвонага дома” не паступіцца незалежнасцю сваёй краіны, хіба толькі ў выпадку, калі ўпэўніцца, што ёсць рэальная магчымасць перескочыць у крэсла цара аб’яднанай дзяржавы. Але ж такое перескоквание маларэальна. Беларускі інтэгратар разумее гэта, таму дзейнічае як звычайны палітычны прагматык. Пад гучныя прызнанні ў любві да ўсходняй суседкі ён выгандлёўвае ў яе эканамічныя прэферэнцыі, танна купляе нафту, газ, сыравіну, выгадна прадае расійскім спажыўцам вырабы беларускіх вытворцаў. Беларусам ад яго хітрыкаў відавочная выгада.

Такая інтэрпрэтацыя інтэграцыйнага сюжэта, безумоўна, мае права на існаванне. Аднак яна не здольна належным чынам патлумачыць і зняць шэраг крытычна небяспечных для беларускай незалежнасці момантаў палітычнай гульні пад назвай “расійска-беларуская інтэграцыя”.

Па-першае, Расія па-ранейшаму застаецца тэрытарыяльным і сыравінным калосам, у яе распараджэнні другі ў свеце (па памерах) арсенал ядзерных узбраенняў. Як пераемніца і спадкаемца загадаўшага доўга жыць Савецкага Саюза, яна адчувае сябе пакрыўджанай. У расійскай свядомасці дамінуюць уяўленні аб расійскай велічы і ідэя сатысфакцыі, выпраўлення гістарычнай “памылкі”, у выніку якой ад Маскоўскай метраполіі збеглі амаль усе, хто працяглы час знаходзіўся пад яе эканамічным і палітычным кантролем. Расійскае насельніцтва, эканамічныя і палітычныя эліты ў сваёй большасці выступаюць носьбітамі комплекса вялікадзяржаўнасці (па іх разуменні, яна — ці не галоўная каштоўнасць гістарычнага існавання Расіі). Для многіх расіян інтэгрыраваць (альбо інкарпарыраваць) Беларусь усё роўна, што аднавіць гістарычную справядлівасць. Таму, нават калі Крэмль альбо “Чырвоны дом” па якіх-небудь прычынах стануць тармазіць рух інтэграцыйнага кола, шматлікія расійскія вялікадзяржаўнікі будуць імкнуцца самастойна штурхаць яго наперад. Гэта тым больш верагодна, што наперадзе інтэграцыйнага працэсу бягуць інтарэсы расійскага сыравіннага комплексу, расійскіх ваенных і звязаных з імі груповак.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

РОЗГАЛАС

Ці вызваліць Рэнэ ван дэр Ліндэн Аляксандра Казуліна?

Бестэрміновая галадоўка Аляксандра Казуліна заклікае дэмакратычныя сілы краіны да актыўных дзеянняў. Такое меркаванне выказалі вядомыя дзеячы беларускай навукі і культуры на пасяджэнні, што адбылося ў Мінску.

Як паведаміў БелаПАН кінарэжысёр і педагог Уладзімір Колас, удзельнікі пасяджэння зазначылі, што галадоўка А.Казуліна заклікана звярнуць увагу на парушэнне правоў чалавека ў краіне, падаўленне іншадумства і расправу з палітычнымі апанентамі ўладаў, а таксама заклікаць дэмакратычныя сілы грамадства да больш мэтанакіраваных і выніковых дзеянняў, уключаючы скліканне чарговага Кангрэса дэмакратычных сіл. *“На пасяджэнні прагучала занепакоенасць імкненнем да наладжвання адносін з прадстаўнікамі ўладаў. Гэтая занепакоенасць выклікана, у прыватнасці, нядаўняй сустрэчай у Маскве старшыні Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы Рэнэ ван дэр Ліндэна са спікерам ніжняй палаты беларускага парламента Уладзімірам Канаплёвым, а таксама запланаваным візітам у Беларусь сп. ван дэр Ліндэна і магчымай яго сустрэчай з Аляксандрам Лукашэнкам. Мы лічым, што гэтыя сустрэчы будуць выкарыстаны беларускімі ўладамі для сваёй легітымізацыі і могуць быць расцэнены як адыход міжнароднай дэмакратычнай супольнасці ад сваёй пазіцыі па асуджэнні таталітарызму ў Беларусі”,* — падкрэсліў У.Колас.

Разам з тым, паводле яго слоў, удзельнікі пасяджэння падтрымліваюць ідэю развіцця адносін Еўрасаюза і ЗША з Беларуссю, аднак лічаць, што гэтыя кантакты павінны быць бескампрамісным з боку дэмакратычнай супольнасці. *“Калі беларускія ўлады зацікаўлены ў наладжванні адносін з Еўропай і ЗША, а таксама імкнуцца стаць на шлях дэмакратызацыі і аднаўлення законнасці ў краіне, то канкрэтным доказам такіх намераў павінна стаць вызваленне Аляксандра Казуліна”,* — сказаў У.Колас. Ён мяркуе, што калі старшыня ПАСЕ ўмовай свайго візіту ў Беларусь не паставіць вызваленне А.Казуліна, то прадстаўнікам дэмакратычных сіл не варта сустракацца з Рэнэ ван дэр Ліндэнам падчас яго знаходжання ў Беларусі.

Марат ГАРАВЫ.

ВЫБОРЫ

Представителей оппозиции в избирательные комиссии не допустили

14 января в Беларуси пройдут выборы в местные Советы депутатов. В минувшую пятницу закончилось формирование территориальных избирательных комиссий. По всей стране их будет более полутора тысяч, 152 из них — в районных центрах и областных городах Беларуси. Но ни в одной не оказалось представителей оппозиционных партий.

Стоит отметить, что в эту избирательную кампанию оппозиция не проявила былой активности и делегировала на выдвижение в участковые комиссии всего 120 своих представителей. Для сравнения, в предыдущих выборах в местные Советы, которые прошли в Беларуси в 2003 году, более тысячи активистов оппозиции пытались пробиться в избирательные участковые комиссии, чтобы следить за ходом выборов и участвовать в подсчете голосов. И в конечном итоге членами участковых избирательных комиссий стал 61 представитель оппозиции.

По данным ЦИК, в эту избирательную кампанию в территориальные комиссии попали представители партий — 45 человек. Но обращает на себя внимание тот факт, что все партийцы — члены партий, поддерживающих курс нынешнего руководства Беларуси. В состав избирательных комиссий вошли 36 членов провластной компартии Беларуси, 4 представителя ЛДП, 2— Аграрной партии и один член социально-спортивной партии.

— Минувшие президентские выборы стали причиной того, что сейчас только 120 представителей оппозиции заявили о своем желании стать членами избирательных комиссий, — считает юрист, специалист по избирательному законодательству **Сергей АЛЬФЕР.** — Сказывается моральная, психологическая травма. На президентских выборах наблюдался чрезвычайно высокий подъем народных масс. Но он очень быстро спал. Политические структуры, единый кандидат от демократических сил оказались в плену старых стереотипов и не были готовы предложить что-то конструктивное тем людям, которые хотели реально изменить ситуацию в Беларуси. В массах наступило разочарование, которое наблюдается и сегодня. Люди не верят, что избирательная кампания в местные Советы может что-то изменить. Они не желают участвовать в фарсе под названием “выдвижение в избирательные комиссии”. Зачем пытаться туда попасть, если изначально известно, что в эту комиссию представителя оппозиции не допустят. И смотрите, что получилось. Делегировали партии 120 человек, и ни один из них не попал в состав территориальных комиссий. Хотя выдвигали партии очень грамотных людей, которые проходили учебу по избирательному праву. Мне по долгу службы приходится сталкиваться с членами избирательных комиссий от власти, и я должен констатировать, что их уровень знаний потрясающе низкий. Некоторые из них даже не читают методичек, подготовленных ЦИКом.

— А возможно ли изменить механизм формирования комиссий?

— Юридически приоритет в создании территориальных комиссий принадлежит исполнительным комитетам и президиумам Советов. Исполком — местный орган вертикали, а значит, ни один чиновник никогда не проголосует за представителя оппозиции. Мы помним, как на прошлых выборах были созданы местные Советы. Практически все они находятся в финансовой зависимости и в подчинении у исполкомов. Значит, и члены президиумов Советов будут голосовать так, как надо.

Кроме того, для органов, которые формируют территориальные комиссии, не установлен юридический принцип отбора членов комиссии. Они набирают в комиссии того, кого посчитают нужным. И когда они отказывают представителю оппозиции, то нет юридических механизмов оспорить это решение.

Эти нормы находятся в соответствии с белорусским законодательством, но не соответствуют международным нормам проведения свободных, справедливых и демократических выборов. Какие же это свободные и справедливые выборы, если членами избирательных комиссий становятся либо люди от власти, либо те, кто будет слепо следовать указаниям исполнительной власти? Получается замкнутый круг. Власть назначает своих людей в избирательные комиссии, а комиссии в свою очередь назначают депутатов.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
27 КАСТРЫЧНІКА 2006 г.

Рэгістрацыя замест прапіскі

Як стала вядома, у Адміністрацыі прэзідэнта падрыхтаваны праект указа аб замене інстытута прапіскі рэгістрацыяй.

Планы замяніць інстытут прапіскі, які аджыў сваё, улады выношваюць даўно. Яшчэ Вярхоўны Савет 13-га склікання ў свой час распрацаваў і планаваў прыняць адпаведны дакумент. Не паспеў. Зараз улады вяртаюцца да таго, што было запланавана 10 год таму.

Новы нарматыўны дакумент прадугледжвае два віды рэгістрацыі: па месцы часовага прабывання і пастаяннага жыхарства. Зараз існуе часовая і пастаянная прапіска. Нейкіх асобых адрозненняў абедзве гэтыя працэдуры — рэгістрацыя і прапіска — не маюць, хаця і здымаюцца некаторыя абмежаванні. Цяпер рэгістрацыя будзе магчыма нават у садовым дамку, калі на яго ёсць тэхпашпарт. Пашыраецца і пералік блізкіх сваякоў, якіх можна рэгістраваць для пастаяннага пражывання.

У новым дакуменце для Мінска, як і ў дадзены момант, прадугледжаны асобы статус. Таму абмежаванні, што тычацца мінскай прапіскі і дзейнічаюць зараз, верагодней за ўсё, застануцца нязменнымі.

Юрась ДУБІНА.

ПАЗІЦЫЯ

Скарына ўсё ж вернецца на свой праспект...

7 мая 2005 года ў нашай сталіцы стала на адзін праспект болей, але пры гэтым зменшылася колькасць вуліц. Напярэдадні 60-х угодкаў Перамогі замест вуліц Варвашэні, Іерусалімскай і Дразда на карце Мінска намаляваўся "праспект Машэрава". А тое, што было праспектам Машэрава дагэтуль, атрымала назву "праспект Пераможцаў".

Разам з Машэравым пад тапанімічную разборку трапіў Францішак Скарына. Ягонае імя знікла з шыльдаў цэнтральнай магістралі горада, якая стала "праспектам Незалежнасці". Апаненты ўлады лічаць, што такім чынам Лукашэнка прадэманстраваў "незалежнасць ад Скарыны" (чытай: ад культуры, ад беларушчыны, ад нацыянальнай гісторыі) і зайздрасць да славы Пятра Міронавіча.

Прайшоў год, і выявілася, што па "Варвашэні", "Дразду" і "Іерусалімскай" грамада надта не сумуе. З нейкіх прычын гэтыя назвы не ўкараніліся ў свядомасць гараджан, не сталі мінчукам роднымі. Не прыжыліся, аднак, і тапанімічныя наватворы. Праспект Незалежнасці блытаюць з аднайменнай плошчай, а праспект Пераможцаў не ўспрымаюць увогуле. Калі сёння ў мінчука запытаць дарогу на праспект Машэрава, дык у адказ ён запатрабуе ўдакладнення: "Стары праспект Машэрава ці новы?"

Цалкам верагодна, што са зменай палітычнай сітуацыі адбудзецца рэванш Скарыны і Машэрава, але ж і назва "праспект Незалежнасці" з карты горада не павінна знікнуць. Ад плошчы Незалежнасці пачынаецца вуліца Маскоўская, якая пераходзіць у вуліцу Чкалава. Абедзве гэтыя назвы з савецкай мінуўшчыны. Для суверэннай краіны і тым больш для яе сталіцы — неактуальныя. На мой погляд, будзе цалкам лагічна ператварыць гэтыя дзве вуліцы (перспектыўны, прывабны для забудоўшчыкаў раён побач з цэнтрам горада) у праспект Незалежнасці.

І яшчэ варыянт. Чаму праспект Дзяржынскага не перайменаваць у праспект Незалежнасці? Сёння любы патрыёт Беларусі скажа, што гэта было б правільна. Шмат людской крыві на руках "Жалезнага Фелікса".

У перспектыве зроблены з вуліц Варвашэні, Іерусалімскай і Дразда праспект, мабыць, захавае свой статус. Не было ў гісторыі Мінска такога, каб праспект зноў вуліцай рабілі. Беручы пад увагу важнасць гэтай магістралі ў структуры горада, яе назва будзе тэмай дыскусіі.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ,
карэнны мінчанін.

ГУЧНАЯ СПРАВА

Суд прызначаны

Суд над адным з лідэраў маладзёжнага дэмакратычнага руху Беларусі Зміцерам Дашкевічам прызначаны на 30 кастрычніка. Слуханні пройдуць у судзе Кастрычніцкага раёна Мінска. Справу будзе разглядаць суддзя Ала Булаш.

Таварышы З.Дашкевіча яшчэ не вызначыліся з тактыкай абароны. *"Сапраўды, прадстаўнікі пракуратуры могуць выклікаць некалькі дзесяткаў сведак. Цяпер мы думаем, што рабіць. Абарона Дашкевіча можа хадайнічаць аб выкліканні прыкладна 700—1000 чалавек, якія падпісаліся ў яго абарону. А можа хадайнічаць і аб выкліканні ў якасці сведак толькі аўтарытэтных у Беларусі людзей, такіх як Рыгор Барадулін, Ніл Гілевіч, вядомых журналістаў, палітыкаў, вучоных, якія таксама паставілі свае подпісы ў абарону нашага таварыша"*, — разважае А.Фінькевіч.

Нагадаем, што Зміцер Дашкевіч абвінавачваецца ў злачынстве, што прадугледжана артыкулам 193-1 Крымінальнага кодэкса Беларусі (дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі), і цяпер знаходзіцца ў следчым ізалятары. Праваабаронцы лічаць, што гэты артыкул Крымінальнага кодэкса не адпавядае Канстытуцыі і міжнародным абавязацельствам Беларусі, і дабіваюцца яго адмены.

САЛІДАРНАСЦЬ

Свабоду Дашкевічу!

Беларускія палітзняволеныя і праваабаронцы заклікаюць падтрымаць Дзмітрыя Дашкевіча. Тэкст заявы падпісалі Андрэй Клімаў, Павел Севярынец, Мікола Статкевіч, Артур Фінькевіч, Міхаіл Разумаў, якія адбываюць розныя тэрміны пакарання за грамадскую дзейнасць, а таксама праваабаронцы Вячаслаў Сіўчык і Валерый Шчукін.

"Мы персанальна ведаем Д.Дашкевіча, хрысціяніна і беларускага патрыёта, які ў сваё 25 гадоў з'яўляецца адным з самых перспектыўных маладзёжных лідэраў. Мы заклікаем палітычныя і грамадскія арганізацыі прыняць заявы ў падтрымку Д.Дашкевіча. Мы заклікаем беларускіх пісьменнікаў і мастакоў падпісваць і перадаваць Д.Дашкевічу свае творы, прадстаўнікоў беларускай нацыянальнай эліты выступіць на яго працэсе і падтрымаць кампанію "Свабоду Дашкевічу", — гаворыцца ў заяве. Таксама асуджаныя палітыкі і праваабаронцы заклікалі сваіх калег, журналістаў і ўсіх, хто мае магчымасць выступіць у СМІ, патрабаваць свабоду Дзмітрыю Дашкевічу і ўсіх, хто можа, прыйсці да будынка суда падчас працэсу над ім.

"Мы лічым, што ідзе падрыхтоўка да чарговага "рэферэндуму" па інкарпарацыі Беларусі ў Расію", — пракаментаваў В.Сіўчык гэтую заяву БелаПАН. Ён яго думку, менавіта таму ўлады Беларусі праводзяць "зачыстку" палітычнага поля і ізалююць дзесяткі беларускіх патрыётаў у турмах і іншых месцах абмежавання волі. *"Крымінальныя справы супраць лідэраў дэмакратычных рухаў, асуджэнне Цімафея Дранчука і Мікалая Астрэйкі, спроба знішчыць незарэгістраваны "Малады фронт" і пазбаўленне волі Дзмітрыя Дашкевіча — толькі чарговыя этапы гэтай "зачысткі"*, — лічыць В.Сіўчык.

Нагадаем, Д.Дашкевіч абвінавачваецца ў парушэнні арт. 193-1 Крымінальнага кодэкса (дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі) і ў гэты момант знаходзіцца ў следчым ізалятары.

Сяргей ПУЛЬША.

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

Справа паплечніка Мілінкевіча будзе разглядацца ў ААН

Савет ААН па правах чалавека прыняў да разгляду скаргу беларускага апазіцыйнага палітыка Віктара Карніенкі, які з'яўляўся адным з кіраўнікоў штаба Аляксандра Мілінкевіча на мінулых прэзідэнцкіх выбарах.

У інтэрв'ю БелаПАН палітык паведаміў, што скарга тычыцца яшчэ парламенцкіх выбараў 2004 года. Тады В.Карніенка балатаваўся ў Палату прадстаўнікоў. Выбарчая камісія прызнала частку подпісаў, сабраных у падтрымку яго вылучэння, несапраўднымі і адмовіла палітыку ў рэгістрацыі. У адказ В.Карніенка ўзяў у людзей, чые подпісы паслужылі падставай для адмовы ў рэгістрацыі, пісьмовыя пацвярджэнні таго факту, што яны падпісваліся ў яго падтрымку, і звярнуўся ў Вярхоўны суд. Аднак суд пакінуў рашэнне выбарчай камісіі ў сіле. Пасля звароту ва ўсе судовыя інстанцыі краіны В.Карніенка, у адпаведнасці з Пактам аб грамадзянскіх і палітычных правах, да якога далучылася Беларусь, звярнуўся ў Савет ААН па правах чалавека.

Паводле слоў В.Карніенкі, ён *"не мае ілюзій"* наконт таго, што рашэнні Савета ААН нейкім чынам паўплываюць на палітычную сітуацыю ў краіне, таму што яны маюць рэкамендацыйны характар. *"Я звяртаўся не для таго, каб аднавіць свае правы, а для таго, каб міжнародныя інстанцыі яшчэ раз убачылі, што ў нас за ўлада і як выконваюцца грамадзянскія і палітычныя правы"*, — сказаў В.Карніенка.

Юрый ПАЦЁМКІН.

Яшчэ раз пра любоў,

альбо Аб тым, як збіраюцца абвесці вакол пальца беларусаў

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Цягнік на Усход будзе чакаць

Па-другое, Аляксандр Лукашэнка ў прынцыпе не можа цалкам адмовіцца ад сваіх інтэграцыйных захадаў. Яго эканамічны курс, папулісцкая рыторыка, якая прыносіць яму буйныя дэвідэнды, істотна залежаць ад прасоўвання (хаця б частковага) тых ці іншых інтэграцыйных абяцанняў і задумак. Зусім нядаўна мы ўсе сталі сведкамі ўзмацнення расійска-беларускіх супярэчнасцяў: Масква аб'явіла аб рэзкім павышэнні коштаў на газ (як няцяжка зразумець, з-за таго, што Мінск пачаў ухіляцца ад інтэграцыйных дамоўленасцяў, у прыватнасці, па пытаннях прыватызацыі цікавых для расійскага бізнесу аб'ектаў беларускай эканомікі і прыняцця Канстытуцыйнага акта). У вачах Лукашэнкі праглядалася непадробная збянтэжанасць, калі на прэс-канферэнцыі для расійскіх рэгіянальных медыяў ён гаварыў аб тым, што паабяцанае расійскім урадам павышэнне коштаў на газ будзе азначаць крах усёй яго інтэграцыйнай палітыкі. З іншага боку, у сэнсе задавальнення сваіх уладных амбіцый, правіцель выціснуў з Беларусі амаль усё, што можна было выціснуць, яго аўтакратычная воля падсвядома імкнецца да пашырэння пляцоўкі палітычнага панавання. Зразумела, што такое пашырэнне магчыма толькі на ўсход. З гэтай прычыны інтэграцыйная гульня для беларускага начальніка ёсць палітычны вобраз жыцця (modus vivendi) і сродак працягу тэрміну знаходжання ва ўладзе.

Па-трэцяе, нават калі дапусціць, што ні Уладзімір Пуцін, ні Аляксандр Лукашэнка не маюць на мэце даводзіць інтэграцыйную гульню да поўнага завяршэння, застаецца гістарычны працэс, яго, так бы мовіць, аб'ектыўныя імператывы. Сёння свет знаходзіцца ў стане глабалізацыі і пераразмеркавання геапалітычных рэсурсаў. Час, калі Расія ўспрымалася ў ролі носьбіта сусветнага зла, якому трэба было супрацьстаяць усёй дэмакратычнай супольнасцю, адышоў у мінулае. Сёння еўрапейская цывілізацыя сутыкаецца з іншымі выклікамі, а ў асобе Расіі бачыць саюзніка і стратэгічнага партнёра. Адпаведна да расійскіх геапалітычных прэтэнзій краіны Захаду ставяцца больш талерантна і з большым паразуменнем, чым гэта было яшчэ дзесяць гадоў таму. А палітычныя вузлы, зацягнутыя апошнім часам на Блізкім Усходзе і ўвогуле ў адносінах з ісламскім светам, паставілі заходнееўрапейскія краіны ў выключную залежнасць ад расійскіх энерганосьбітаў (ужо сёння 44% спажываемага газу заходнееўрапейцы купляюць у Расіі). У гэтых абставінах Заходняя Еўропа наўрад ці здольна кіравацца выключна прыярытэтамі беларускай дэмакратыі і незалежнасці. Як прынята казаць, ёсць падставы меркаваць, што ў палітычных пасьянсах заходніх палітыкаў Беларусь будзе ўсё часцей фігураваць як частка нафта-газавага транзіту, крэатыўны кантроль над якім належыць "расійскаму партнёру". Зразумела, пры гэтым і далей будуць гучаць абсалютна правільныя словы ў падтрымку каштоўнасцяў беларускай дэмакратыі... Пасля таго як 26 верасня старшыня Еўрапейскай камісіі Жазэ-Мануэль Барозу абвясціў аб тым, што, вобразна кажучы, еўрапейскі клуб зачынены, пашырэнне Еўрапейскага Саюза спынена, беларуская дэмакратыя фактычна апынулася на раздарожжы і ў адзіноце. Перад ёй паўстае пытанне далейшага самавызначэння. Хацелася б памыліцца, аднак вельмі падобна, што Беларусь спазнілася і даганяць цягнік на Захад ёй будзе ўсё цяжэй і цяжэй. А вось цягнік на Усход гатовы чакаць. У выпадку, калі ён дачакаецца, у беларускай дзяржавы застануцца галоўным чынам дзве магчымасці: альбо засвоіць статус суб'екта Расійскай федэрацыі, альбо, захаваўшы фармальныя прыкметы самастойнасці і незалежнасці, зрабіцца яе паслядоўным сатэлітам. Аднак за апошні варыянт трэба яшчэ пазмагацца.

Рэферэндум у святле сацыялогіі

У рэалізацыі інтэграцыйнага праекта, вырашэнні пытання аб тым, наколькі далёка можа быць прасунута інтэграцыя, відавочна прынцыповая роля ўладамі надаецца рэферэндуму. Таму зусім не выпадкова, што сярод спрэчных пунктаў, якія пакінуты на разгляд Пуціна і Лукашэнкі, фігуруе, па словах сп. Канаплёва, менавіта парадак правядзення рэферэндуму?

Як сведчыць найноўшая гісторыя, у руках не абцяжараных дэмакратычнымі перакананнямі палітыкаў плебісцыт лёгка ператвараецца ў небяспечны інструмент маніпуляцыі грамадскай свядомасцю. Адна справа, скажам, калі рэферэндум у Беларусі правесці на падставе крытэрыяў і працэдур, якія выпрацаваў і адсочвае "Чырвоны дом". У гэтым выпадку гаспадар можа быць упэўнены, што Цэнтрвыбаркам дабудзе вынікі, якія цалкам задаволяць "яго светласць". Бо і выбарчыя камісіі, і працэдура галасавання, і падлік пададзеных галасоў, і фармулёўкі ў бюлетэнях будуць вызначацца і кантралявацца ў адпаведнасці з напрацаванымі тэхналогіямі. Калі ж рэферэндум пройдзе ў адпаведнасці з нейкімі новымі схемамі, будзе падпрадкаваны метадалогіі, выпрацаванай з удзелам расійскага боку, патрэбны вынік можа не атрымацца.

У сказаным лёгка перакананацца, калі пазнаёміцца з адпаведнымі сацыялагічнымі даследаваннямі. Звернемся да агульнанацыянальнага апытання грамадскай думкі, праведзенага зарэгістраваным у Літве Незалежным інстытутам сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў (НІСЭПД) 15—25 жніўня. У метадалагічным плане яно падаецца адным з найбольш талковых сярод шматлікіх сацыялагічных даследаванняў апошніх год, прысвечаных, сярод іншага, інтэграцыйнай тэматыцы і магчымаму рэферэндуму (гл.: Бюлетэнь "Навіны НІСЭПД" № 3 (41) Верасень 2006 г.; у электронным выглядзе — на сайце www.iiseps.org).

З атрыманых даных цалкам канкрэтна вынікае: калі рэферэндум ладзіць сумленна і карэктна, беларусы ніколі не падтрымаюць інтэграцыю ў яе крайніх праявах. Таму, як няцяжка здагадацца, гульня ў рэферэндум набывае асаблівую вастрыню. Бок, які здолее навязаць плебісцыту сваю, так бы мовіць, каляіну, адпаведна атрымоўвае дадатковы шанц вызначыць канчатковы накірунак і межы інтэграцыйнага працэсу.

Адказы рэспандэнтаў на ўводнае пытанне "інтэграцыйнага" блоку апытальніка (інструментарыя) на першы погляд выявілі даволі сумную карціну.

Табліца 1. Адказы на пытанне **"Калі б сёння праходзіў рэферэндум аб аб'яднанні Беларусі і Расіі, як бы Вы прагаласавалі?"** (для параўнання, у другім слупку табліцы прыведзены даныя адказаў на аналагічнае пытанне ў снежні 2002 года).

Варыянты адказаў %	Жнівень 2006 г.	Снежань 2002 г.
За аб'яднанне	45.4	53.8
Супраць аб'яднання	34.2	26.3
Не стаў бы ўдзельнічаць у галасаванні	9.6	7.8
ЦА/НА	10.8	12.1

Прыведзеныя варыянты меркаванняў рэспандэнтаў быццам бы не пакідаюць сумненняў у тым, што прыхільнікі інтэграцыі пераважаюць яе праціўнікаў. Тым не менш не варта спяшацца. Для пачатку мае сэнс звярнуць увагу на тое, што колькасць прыхільнікаў інтэграцыі за пяць год заўважна зменшылася, а колькасць праціўнікаў — адпаведна павялічылася. Гэтая тэндэнцыя пераразмеркавання ўдзельнай вагі прыхільнікаў і праціўнікаў сведчыць аб тым, што інтэграцыйная ідэя губляе сваю прываблівасць.

Аднак галоўнае ўсё ж не ў пераразмеркаванні галасоў "за" і "супраць". Даўно заўважана, што чорна-белая карціна ўвогуле дрэнна адлюстроўвае рэальны стан рэчаў. Калі праблему інтэграцыі падаць у сацыялагічным апытальніку (інструментарыі) больш дэталёва, атрымаецца больш глыбокая выява інтэграцыйных настрояў. І, галоўнае, больш правільная (пра гэтыя метадалагічныя "дробязі" мне даводзілася пісаць яшчэ ў 2001 годзе).

Адказы рэспандэнтаў на пытанне, сфармуляванае варыятыўна, з улікам асноўных накірункаў магчымага развіцця інтэграцыйнага працэсу, не пакідаюць месца ілюзіям так званых "інтэграстаў".

Табліца 2. Адказы на пытанне **"Якому варыянту інтэграцыі Беларусі і Расіі Вы б асабіста аддалі перавагу?"** (для параўнання, у другім слупку табліцы прыведзены даныя адказаў на аналагічнае пытанне ў снежні 2002 года).

Варыянты адказаў %	Жнівень 2006 г.	Снежань 2002г.
Беларусь і Расія павінны стаць адной дзяржавай, з адзіным прэзідэнтам, урадам, войскам, сцягам, валютай і т.п.	14.0	21.2
Беларусь і Расія павінны ўтварыць саюз незалежных дзяржаў, звязаны цеснымі палітычнымі і эканамічнымі адносінамі	51.7	51.7
Адносіны Беларусі і Расіі павінны быць такімі ж, як і з іншымі краінамі СНД	28.7	19.7

«Адабрамс» ніяк не праходзіць

Як бачым, 51.7% беларусаў аддаюць перавагу цесным палітычным і эканамічным адносінам двух народаў, дзяржавы якіх, на думку рэспандэнтаў, хоць і павінны існаваць у саюзе, але існаваць незалежна. Калі да гэтай групы рэспандэнтаў далучыць тых, хто лічыць, што адносіны паміж Беларуссю і Расіяй не павінны адрознівацца ад адносін з іншымі краінамі СНД, то атрымаецца ўнушальная кагорта грамадзян, якія не падтрымліваюць, так бы мовіць, унітарысцкі праект расійска-беларускай інтэграцыі. На карысць гэтага тэзіса сведчаць адказы на яшчэ адно пытанне (гл. табліцу №3). Як і адказы на папярэдняе пытанне, меркаванні рэспандэнтаў па дадзеным пытанні дазваляюць рабіць упэўненую выснову: для чатырох пятых грамадзян Беларусі любоў да "вялікага брата" (калі яна толькі існуе) не здольна пераважыць каштоўнасць дзяржаўнай незалежнасці, з якой яны звязваюць сваю будучыню.

Табліца 3. Адказы на пытанне **"Ці падтрымліваеце Вы такі варыянт інтэграцыі Беларусі і Расіі, пры якім Рэспубліка Беларусь перастане быць незалежнай, суверэннай краінай?"**

Варыянты адказаў	%
Так	21.1
Не	78.5
НА	0.4

Інакш кажучы, пры існуючым рэальным раскладзе грамадскай думкі (80% беларусаў жадаюць бачыць беларускую дзяржаву незалежнай, і толькі прыкладна 20% гатовы зліцца ў палітычным экстазе з Расіяй) усенароднае "адабрамс" ніяк не праходзіць. Цяперашняму палітычнаму кіраўніцтву, якое ўпарта трымаецца на баку гэтай меншасці, каб атрымаць на рэферэндуме "патрэбныя" вынікі, неабходна выкарыстоўваць маніпулятыўныя тэхналогіі. Што гэта за тэхналогіі — добра вядома з практыкі правядзення плебісцытаў у апошнія дванаццаць гадоў. Іх сцэнарысты і рэжысёры наўмысна зыходзяць з сумнеўнага пастулата аб тым, што ў свядомасці людзей існуе нейкі уніфікаваны "правільны" погляд на тую ці іншую праблему. Больш таго, гэты погляд амаль цалкам адпавядае ўяўленням палітычнага кіраўніцтва. Рэферэндумнае пытанне фармулюецца і выносіцца на галасаванне ў такім выглядзе, каб можна было лёгка выцягнуць з чалавека "патрэбны" адказ.

Параўнанне даных 1-й табліцы з данымі 2-й і 3-й табліц якраз сведчыць аб тым, што ідэю інтэграцыі Беларусі і Расіі розныя катэгорыі людзей разумеюць па-рознаму, ніякай уніфікаванасці адпаведных поглядаў не існуе. Як не існуе і пачуццяў, якія б безаглядна штурхалі большасць беларусаў у брутальныя абдымкі "вялікага брата". **Тым не менш кіраўніцтва краіны, замест таго каб удакладніць і растлумачыць сэнс расійска-беларускай інтэграцыі, звярнуць увагу грамадзян на яе неадназначнасць, убівае ў галовы людзей абсалютна далёкае ад ісціны ўяўленне аб тым, што беларусы могуць рэалізаваць сваю любоў да ўсходняй суседкі шляхам поўнага зліцця з Расіяй і пры гэтым не страціць незалежнасць.**

* * *

Такім чынам, рэферэндум па прынцыпі Канстытуцыйнага акта (па сутнасці, аб'яднаўчы рэферэндум), гульню вакол якога зараз вядуць Масква і Мінск, — палітычнае мерапрыемства, для лёсу Беларусі зусім не бяскрыўднае. У выпадку правядзення яго нельга будзе лічыць сапраўдным волевыяўленнем беларускага народа. Усё гэта трэба тлумачыць людзям. Тлумачыць неадкладна і гучна, што іх ў чарговы раз збіраюцца абвесці вакол пальца. Аднак пакуль у беларускім грамадстве пануе цішыня, якая больш нагадвае маўчанне ягнят...

РЭЙТЫНГ

У нас крыху лепш, чым у Паўночнай Карэі

Міжнародная арганізацыя "Рэпарцёры без межаў" абнародавала новы рэйтынг краін па свабодзе прэсы. Усяго ацэньвалася 168 краін. Беларусь трапіла ў апошні блок, дзе сітуацыя з прэсай найгоршая, і заняла 151-е месца са 168 магчымых.

Найгоршай краінай названа Паўночная Карэя, дзе незалежных СМІ няма наогул. Лепш за ўсё адчуваюць сябе журналісты ў Фінляндыі, Ісландыі і Ірландыі.

Ул.інф.

ПРОИСШЕСТВИЯ

Рухнул мост

В минувшую пятницу в Слониме произошло чрезвычайное происшествие: рухнули пролеты моста над рекой Щара, который в данное время находится на ремонте. Мост сложился, как карточный домик, его части оказались в воде. В реке также оказался и подъемный кран, который стоял на мосту. Из машины выпали рабочие, которые на момент происшествия находились в ней.

Около получаса длились спасательные работы по извлечению с рухнувшего моста людей. Двое рабочих получили телесные повреждения — перелом грудной клетки и тазобедренных суставов. Как сообщает "Газета Слонимская", они были доставлены в травматологическое отделение местной больницы.

ВЕРДЫКТ

Прыгавор па «ўгарнай справе» вынесены ў Баранавічах

У свой час гэта трагедыя ўскалыхнула ўсю краіну. У сярэдзіне лютага гэтага года ў Баранавічах у доме 68 па вуліцы Тэльмана былі знойдзены трупы пяці жыхароў, а яшчэ шэсць у цяжкім стане трапілі ў бальніцу. Як адразу паведамілі спецыялісты, прычынай трагедыі стаў угарны газ.

У судзе гэта версія пацвердзілася. З-за таго, што ў вентыляцыйную шахту трапіў голуб, угарны газ ад газавай калонкі выходзіў у кватэры. Вінаватымі ў гэтым прызнаны начальнік мясцовага ЖЭС Канстанцін Фалькоўскі і майстар ЖЭС, на ўчастку якой знаходзіўся гэты дом, Валянціна Бондар. Абодва прызнаны вінаватымі ў службовай халатнасці і атрымалі ўмоўныя тэрміны пакарання.

Алег СНОЎ.

КРЫМІНАЛ

Дадому, дахаты...

Аляксандр Крэмзікаў, лідэр арганізаванай злачыннай групы, што дзейнічала ў краіне ў 1997—2001 гадах у асноўным на тэрыторыі Мінскай вобласці, затрыманы ў Маскве. Як паведамляецца, ён будзе экстрадыраваны ў Беларусь.

Лідэру злачыннай групы інкрымінуюцца крадзяжы, бандытызм, наўмыснае пашкоджанне маёмасці, разбойныя напады, захоўванне агнястрэльнай зброі. Члены групоўкі А.Крэмзікава былі асуджаны на значныя тэрміны зняволення ў 2001 годзе.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

ЗДАРЭННЕ

12 сутак у незнаёмым лесе

Ніяк не мог прадбачыць жыхар Віцебска Міхаіл Міронаў, што прыезд у госці да яго цёткі з Тулы абернецца такімі доўгімі хваляваннямі і запатрабуе амаль двухтыднёвых пошукаў гэтай немаладой жанчыны ў незнаёмым лесе.

Пагасцяваўшы колькі дзён у віцебскага пляменніка, Зоя Ігнатаўна падалася на сваю радзіму, у суседні з Віцебскім Веліжскі раён Смаленшчыны. Там, у вёсцы Хацькоўшчына, прыезджую зямлячку запрасілі ў лес, па журавіны, якімі славутыя тамтэйшыя мясціны. Ягад сапраўды было шмат, і жанчына, захапіўшыся "ціхім паляваннем", заблудзілася. У выніку яна правяла ў лесе аж 12 сутак!

Спярша яе шукалі ратавальнікі і міліцыянеры з Веліжа, а потым, калі гэтыя пошукі ні да чаго не прывялі, на дапамогу цётухне кінуўся Міхаіл Міронаў разам са сваім сынам Віталем і братам Зоі Ігнатаўны Мікалаем, які адмыслова, паводле тэлеграмы, прыляцеў са Стаўрапаля. Якраз Мікалаю пашанцавала: пэўна, роднаснае пачуццё падказала яму напрамак пошукаў. На трынаццаты дзень у трох кіламетрах ад вёскі Мікалай заўважыў сястру, якая амаль без прытомнасці ляжала пад велізарным дрэвам.

Шчаслівыя брат і сястра кінуліся абдымацца.

У той жа дзень госцю Віцебска даставілі да пляменніка, а потым — у Віцебскую абласную клінічную бальніцу.

— Харчавалася я ў лесе лісцем чарніц, маліны, — распавядала Зоя Ігнатаўна. — Лісце брусніц есці не магла: яно вельмі грубае. Ела ягады крушыны, зрэдку трапляліся познія маліны. Ела і грыбы, якія, на жаль, былі ў асноўным чарвівыя. Ноччу прыкрывалася ад холаду яловымі лапкамі. Было страшна, але, як ні дзіўна, ніякіх звяроў не сустракала: ні ваўкоў, ні зайцоў, ні змей, ні нават жаб. На шостыя суткі заўважыла, што мяне пераследуюць нейкія людзі ў чорным адзенні. Сярод іх была жанчына, якая гаварыла, што прагне маёй крыві. Я ад гэтых людзей збягала, клічучы паратунку. Але яны паспелі адняць у мяне ўсю сабраную клюкву разам з вядром і мяшком. Але я здагадалася схаваць залатыя завушніцы ў гумовых ботах. Мяне знайшлі, калі я ўжо асіпла ад крыку.

Зоя Ігнатаўна пахудзела, але на гэта не зважае. У яе моцна пакусаны камарамі рукі і ногі, апух твар. А вось тое, што за ёй нібыта гналіся зламыснікі ў чорным — хутчэй за ўсё вынік начных кашмараў, галюцынацыі стомленага мозгу.

Добра, што 12-сутачная вандроўка пажылой жанчыны завяршылася шчасліва. Магло быць горш, бо лес не шкадуе непадрыхтаванага да выпрабаванняў чалавека. Няцяжка здагадацца, чым бы завяршылася лясная "адысея" Зоі Ігнатаўны, каб ёй сустрэліся галодныя драпежнікі або сярод ядомых грыбоў раптоўна трапілася паганка...

Сяргей БУТКЕВІЧ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
27 КАСТРЫЧНІКА 2006 г.

РУБАМ!

Чаму адкрылі візы Галаванаву і Пяткевіч?

У мінулы панядзелак прэм'ер-міністр Беларусі **Сяргей Сідорскі** падпісаў пастанову Савета міністраў №1356 аб накіраванні ўрадавай дэлегацыі Рэспублікі Беларусь у Швейцарскую Канфедэрацыю.

У Жэневу для правядзення кансультацый у штаб-кватэру Міжнароднай арганізацыі працы па пытаннях, звязаных з рэкамендацыямі гэтай арганізацыі, з'ездзілі намеснік прэм'ер-міністра **Андрэй Кабякоў**, намеснік кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта **Наталля Пяткевіч**, міністр юстыцыі Беларусі **Віктар Галаванаў**, першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны **Алена Колас,** намеснік начальніка ўпраўлення фінансавых зносін галоўнага эканамічнага ўпраўлення апарату Савета міністраў **Аляксандр Румак**, намеснік генеральнага дырэктара Мінскага аўтамабільнага завода **Эдуард Падаляк** і начальнік упраўлення знешніх сувязяў і партнёрскай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны **Ігар Старавойтаў.**

Цікава, што ў складзе гэтай чыноўніцкай дэлегацыі апынуліся двое "невыязных" — **Наталля Пяткевіч** і **Віктар Галаванаў.**

Нагадаю, што 10 красавіка бягучага года Савет Еўрапейскага Саюза на пасяджэнні ў Люксембургу зацвердзіў спіс беларускіх чыноўнікаў, якім забаронены ўезд на тэрыторыю краін Еўрасаюза з-за іх "асаблівых заслуг" перад беларускім грамадствам. Забарона на ўезд дзейнічае на працягу года.

Як паведамілі "Народнай волі" ў беларускім Міністэрстве замежных спраў, візу ў Жэневу нашы грамадзяне могуць атрымаць толькі праз Маскву, а дакладней — праз амбасаду Швецыі. Значыць, Пяткевіч і Галаванаву ставілі штампікі ў пашпарт менавіта там. Прычым без усялякіх праблем.

Тым больш што гэта ўжо не першы выпадак, калі маскоўскія клеркі адкрываюць візы для невыязных беларусаў. Напрыклад, у гэтым годзе таксама праз Маскву атрымаў візу ў Партугалію старшыня Нацыянальнай Белтэлерадыёкампаніі **Аляксандр Зімоўскі**.

Марына КОКТЫШ.

СТОП-ЛІСТ

У «чорным» спісе...

1. **Аляксандр Лукашэнка,** кіраўнік дзяржавы
2. **Генадзь Нявыглас**, кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта
3. **Наталля Пяткевіч**, намеснік кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта
4. **Анатоль Рубінаў,** намеснік кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта
5. **Алег Праляскоўскі**, кіраўнік ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі прэзідэнта
6. **Аляксандр Радзькоў,** міністр адукацыі
7. **Уладзімір Русакевіч,** міністр інфармацыі
8. **Віктар Галаванаў**, міністр юстыцыі
9. **Аляксандр Зімоўскі,** старшыня Белтэлерадыёкампаніі
10. **Уладзімір Канаплёў**, старшыня Палаты прадстаўнікоў
11. **Мікалай Чаргінец,** член Савета Рэспублікі
12. **Сяргей Касцян,** дэпутат
13. **Міхаіл Арда**, дэпутат
14. **Мікалай Лазавік**, сакратар Цэнтрвыбаркама
15. **Пётр Міклашэвіч**, генпракурор
16. **Алег Сліжэўскі,** кіраўнік упраўлення грамадскіх аб'яднанняў Міністэрства юстыцыі
17. **Аляксандр Харытон**, галоўны спецыяліст упраўлення грамадскіх аб'яднанняў Міністэрства юстыцыі
18. **Яўген Смірноў,** намеснік старшыні Вышэйшага Гаспадарчага суда
19. **Надзея Рэвуцкая,** суддзя Маскоўскага суда Мінска
20. **Мікалай Трубнікаў,** суддзя Партызанскага суда Мінска
21. **Мікалай Купрыянаў,** намеснік генпракурора.
22. **Сцяпан Сухарэнка,** старшыня КДБ
23. **Васіль Дземянцей,** намеснік старшыні КДБ
24. **Леанід Козік,** старшыя Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі
25. **Аляксандр Каляда,** член Цэнтрвыбаркама
26. **Мікалаў Вусаў,** член Цэнтрвыбаркама
27. **Леанід Лучына**, член Цэнтрвыбаркама
28. **Таццяна Краўчанка**, член Цэнтрвыбаркама
29. **Уладзімір Курловіч**, член Цэнтрвыбаркама
30. **Мікалай Мяцеліца,** член Цэнтрвыбаркама
31. **Міхаіл Пішчулёнак**, член Цэнтрвыбаркама
32. **Віктар Шэйман**, цяперашні дзяржсакратар Савета бяспекі
33. **Юрый Сівакоў**, былы міністр унутраных спраў
34. **Уладзімір Навумаў**, міністр унутраных спраў
35. **Дзмітрый Паўлічэнка**, камандзір спецыяльнага атрада хуткага рэагавання
36. **Лідзія Ярмошына**, старшыня Цэнтрвыбаркама
37. **Юрый Падабед**, камандзір палка спецыяльнага прызначэння
38. **Аляксей Рыбакоў**, суддзя Маскоўскага суда Мінска
39. **Сяргей Бортнік,** дзяржаўны абвінаваўца
40. **Леанід Ясіновіч,** суддзя Цэнтральнага суда Мінска
41. **Андрэй Мігун**, дзяржаўны абвінаваўца.

КАМПЕТЭНТНА

Андрэй САННІКАЎ, былы намеснік міністра замежных спраў Беларусі:

— Я лічу, што калі існуе спіс невыязных чыноўнікаў, то забароны ў адносінах да гэтых людзей павінны дзейнічаць. Нягледзячы ні на што.

Што тычыцца паездкі Аляксандра Зімоўскага на 57-ю сесію Еўрапейскага вяшчальнага саюза, то гэта сапраўды было парушэннем. Таму што сесія не з'яўляецца пастаянна дзеючай міжнароднай арганізацыяй. Сесіі праводзяцца ў розных краінах, няма пагаднення, якое агаворвае ўсе гэтыя моманты. Таму ў выпадку з Зімоўскім, натуральна, былі парушаны санкцыі ЕС. Хаця Партугалія прытрымліваецца ідэі захавання адносін з беларускім рэжымам.

Чаму Пяткевіч і Галаванаву выдалі візы?

Па-першае, Швейцарыя не член Еўрасаюза. Па-другое, дзейнічае правіла міжнародных арганізацый: дзяржавы, на тэрыторыі якіх дзейнічаюць такія арганізацыі, падпарадкоўваюцца ў дадзеным выпадку іх рэжыму. Напрыклад, нават Фідэль Кастра ў свой час лятаў у Злучаныя Штаты Амерыкі, паколькі Куба — член ААН... Міжнародная арганізацыя працы — гэта, як і ААН, таксама міжнародная арганізацыя.

Канешне, калі б Швейцарыя зрабіла адпаведныя рэкамендацыі, то іх паездка магла б і не атрымацца. Але швейцарцы вельмі дбайна ставяцца да выканання абавязкаў прымаючага боку многіх міжнародных арганізацый. Але я лічу, што нават у такім выпадку выключэнняў не павінна быць...

САНКЦЫІ

«Чорны спіс» папоўніўся

Савет Еўрасаюза 23 кастрычніка прыняў рашэнне аб пашырэнні спіса беларускіх чыноўнікаў, якім забаронены ўезд на тэрыторыю ЕС.

У спіс неўязных чыноўнікаў унесены яшчэ чатыры чалавекі — суддзя Маскоўскага суда Мінска **Аляксей Рыбакоў** і дзяржаўны абвінаваўца **Сяргей Бортнік** за прыгавор Аляксандру Казуліну, а таксама суддзя Цэнтральнага суда Мінска **Леанід Ясіновіч** і дзяржаўны абвінаваўца **Андрэй Мігун** за прыгавор актывістам незарэгістраванай арганізацыі "Партнёрства".

Першапачатковы спіс беларускіх чыноўнікаў, якія, на думку ЕС, маюць дачыненне да знікненняў палітыкаў у 1999—2000 гадах, складаўся з шасці чалавек. У іх ліку — міністр унутраных спраў Уладзімір Навумаў, былы кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта **Віктар Шэйман**, былы міністр спорту і турызму **Юрый Сівакоў**, які ў перыяд знікнення палітыкаў займаў пасаду кіраўніка МУС, і камандзір брыгады спецыяльнага прызначэння ўнутраных войскаў МУС **Дзмітрый Паўлічэнка**. У снежні 2004 года, пасля парламенцкіх выбараў і рэферэндуму, у спіс былі ўключаны кіраўнік ЦВК **Лідзія Ярмошына** і начальнік мінскага АМАП (зараз полк міліцыі спецыяльнага прызначэння) **Юрый Падабед**.

